## Алімпіяда па беларускай мове
6 клас

**1. Якія гукі выконваюць ролю адрознівальнікаў сэнсу ў наступных парах слоў? Запішыце.**

Баец – барэц, лёгка – лёжка, лясны – ясны, снег – смех, ёд – яд, рэдзька – рэдка, вяду – ваду.

*Максімальная колькасць – 3 балы*

**2. Запішыце назвы ягад па-беларуску.**

Брусника, земляника, клюква, ежевика, черника, клубника. *1 бал*

**3. Што лішняе сярод слоў адпаведнага радка? Укажыце прычыну, па якой слова лічыцца лішнім.**

а) Воблакі, азёры, вокны, вароты, вушы.

б) Дэпо, метро, кіно, акно, трыо.

в) Восень, гусь, радасць, боль, рунь. *Правільна вылучанае слова – 0,5 бала,*
*1 абгрунтаванне – 1 бал*

**4. Ад назваў *мядзведзь, алень, авечка, карова* ўтварыце назвы маладых істот. З утворанымі словамі складзіце і запішыце па 1 сказе.**

*Максімальная колькасць – 4 балы*

**5. Устаўце прапушчаныя літары.**

Б…тон, зака...чык, інж…нер, мала...ьба, мес…ц, пя...чота, р...мень, с…мёра, тун…ль, дакла…чык.

*Правільны адказ – 0,5 бала*

**6. Падбярыце антонімы да прыметнікаў.**

Свежы (хлеб), свежая (газета), ціхі (дзень), ціхі (голас), новы (дзень), новая (кніга).*Максімальная колькасць – 3 балы*

**7. Вызначце, да якога стылю адносіцца тэкст і абгрунтуйце свой выбар.**

Даўжыня цела бусла 98–106 сантыметраў, маса 2,9–3,5 кілаграма. Апярэнне белае з чорным на крылах. Ногі і дзюба чырвоныя. Размах крылаў 2,25 сантыметра. Прылятае ў канцы сакавіка – пачатку красавіка. Гнездавацца пачынае з трохгадовага ўзросту. Гнёзды з галля высцілае сухой травой і мохам, будуе на дахах дамоў і гумнаў, на высокіх дрэвах, пераважна ў сельскай мясцовасці, выкарыстоўвае іх штогод. Адлятае белы бусел у жніўні-верасні. Зімуе ў Паўднёвай і Цэнтральнай Афрыцы.

*Максімальная колькасць – 4 балы*

**8. Запішыце словы ветлівасці, якія прынята ўжываць пры сустрэчы.**

*Адзін выраз – 0,5 бала*